Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 1 (624) Пятніца 14 студзеня 1966 г. Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## Сесія!



*Студэнт Віталій ЗАРЭЦКІ адзін з лепшых на юрыдычным факультэце. На працягу вучобы ён не атрымаў ніводнай адзнакі ніжэй «выдатна». У гэтую сесію Зарэцкі таксама здае экзамены толькі на «пяцёркі».*

*— Вучыцца толькі так, быць прыкладам ва ўсім для сваіх таварышаў, гэтаму мяне абавязвае высокае званне камуніста, — гаворыць Віталій.*

## ЭКЗАМЕНЫ І ВЫНІКІ

У лабараторыях, кабінетах і бібліятэках адчуваецца напружаны пульс жыцця—ідзе сесія. Пройдземся па некаторых аўдыторыях геаграфічнага факультэта і паглядзім, як здаюць студэнты?

Да экзамена па гісторыі КПСС першакурснікі рыхтаваліся старанна. Выкладчык дацэнт А. Ул. Царук — добры лектар, па першакрыніцах на працягу семестра было праведзена шмат семінарскіх заняткаў. Здавалася б, што такая падрыхтоўка павінна была даць і добры плён, але амаль з сотні студэнтаў курса выдатна атрымалі толькі Г. Гулецкая, І. Ванслаў, Л. Ішына, Т. Скарынкіна і ўсё—астатнія «добра» і «здавальняюча». Горш таго, Л. Лысуха, Ул. Лазечный, Ул. Камісараў атрымалі «нездавальняюча».

Куды лепш за першакурснікаў здае экзамены другі курс факультэта. Для прыкладу, прывяду такую лічбу: амаль палова студэнтаў першай групы экзамен па метэаралогіі здала на «выдатна».

— Думаю, што другая група не падвядзе першую,—гаворыць выкладчык гэтага курса прафесар А. Е. Шкляр. — Студэнты добра падрыхтаваліся па гэтай важнай для іх дысцыпліне...

Асаблівую цікавасць праяўляе III курс да гістарычнага матэрыялізму. Экзамен паказаў, што студэнты на працягу семестра выкарысталі вялікую колькасць праграмнай і дапаможнай літаратуры па гэтаму прадмету. Ніводнай не разабранай на семінарскіх занятках тэмы — з такім вынікам прыйшлі яны да экзамена. Таму і не дзіўна, што ў большасці залікоўках з'явіліся «выдатна» і «добра» і толькі тры «здавальняюча» на ўсім курсе. Здавалася, што трэцякурснікі факультэта ўзялі выдатны старт, але першыя крокі—не мерка фінішу. Недапушчальным тут з'яўляецца тое, што некаторыя студэнты маюць нездавальняючыя па фізічнай геаграфіі частак свету і шмат здавальняючых па фізічнай геаграфіі СССР.

Большасць выдатных і добрых адзнак на IV курсе геафака па палітычнай эканоміі, але недаацанілі студэнты сваіх ведаў па курсу дыялектычнага матэрыялізму. 12 нездавальняючых, кожны трэці не здаў экзамена!

Дацэнт Аркадзій Іванавіч Ляўко— выкладчык гэтага курса — прынцыповы і патрабавальны да студэнтаў педагог.

— Інакш нельга,—гаворыць ён, — шэсць дзён аўралу не дае ведання філасофіі. Тут патрэбна старанная праца, на працягу ўсяго семестра. Лекцыя, самастойная работа над тэмай, пасля семінар і зноў самастойная работа — толькі так можна засвоіць гэты складаны прадмет. А то што атрымліваецца? Многія студэнты замест грунтоўнага адказу прыпаднеслі мне такі «вінягрэт» што хоць вушы затыкай. Гегеля называлі «матэрыялістам», а Фейербаха—«наміналістам»...

Нельга тут не згадзіцца з выкладчыкам. Хто заўсёды наведваў лекцыі, старанна рыхтаваўся да семінарскіх заняткаў, той на экзамене па дыямату паказаў глыбокія веды. М. Сушкевіч, Л. Нікалаева, І. Лазнуха здалі яго на «выдатна».

На маю думку, патрэбна ўсім студэнтам пералічаных курсаў факультэта ўзяць прыклад са сваіх старэйшых таварышаў—пяцікурснікаў. З добрым багажом ведаў пойдуць у хуткім часе яны працаваць у школы і на прадпрыемствы нашай краіны. А пакуль што ў іх апошняя сесія. 11 студэнтаў курса здаюць яе толькі на «выдатна», астатнія 25 толькі на «добра». Ніводнай здавальняючай! Выдатны поспех у пяцікурснікаў.

Вынікі сесіі на геафаку гавораць аб тым, што большая частка студэнтаў з вялікай цікавасцю і стараннасцю рыхтуецца да кожнага чарговага экзамена. Першыя крокі даюць права меркаваць, што здадуць сесію студэнты куды лепш, чым мінулагоднюю.

**Я. ПАЎЛЮЦЬ.**

## Сесія!





**Студэнту перад экзаменам заўсёды нехапае «аднаго дня». Няма нават часу — бывае — распрануцца. Прыцемак ці не прыцемак, дзень ці ноч — а студэнт чытае, імкнучыся абагнаць час, як, напрыклад, весь гэтыя засяроджаныя дзяўчаты з біяфака, якіх вы бачыце на здымку справа. Здаецца, больш упэўнена адчуваюць сябе дзяўчаты чацвёртага курса матфака А. Глюза і Г. Абрамовіч. Ні пуху, ні пяра ўсім вам, нашы дзяўчаты і хлопцы.**

Фота **У. Бакунова.**

*Партыйнае жыццё*

## ПАВЫСІЦЬ БАЯЗДОЛЬНАСЦЬ ПАРТГРУП!

Нядаўна адбылося чарговае пасяджэнне парткома універсітэта, дзе разглядалася пытанне аб рабоце партыйных студэнцкіх груп філалагічнага факультэта.

Зараз на факультэце налічваецца 9 партыйных студэнцкіх груп, якія аб'ядноўваюць больш як 80 маладых камуністаў. Многія з іх сваёй добрай вучобай і актыўным удзелам у грамадскім жыцці паказваюць прыклад для другіх. Але гэтага не скажаш аб Якімчыку, Гладышаву, Знаку, Кулікавай, Вайруха, Ціханаўцу, Слушніку і іншых. Ёсць яшчэ і аматары пропускаў: Слушнік, Харытонаў, Дарашэнка. Усяляк ухіляюцца ад партыйных даручэнняў камуністы Пармон, Каліціеўскі. Яшчэ недастаткова ўцягваюцца ў грамадскае жыццё маладыя камуністы. Некаторыя з іх лічацца агітатарамі, але працуюць слаба.

У большасці партыйных груп работа ідзе па плану. групоргі вядуць дзённікі. У групах праводзяцца сходы, на якіх абмяркоўваюцца пытанні вучобы, побыту і іншае.

Аднак у рабоце партыйных груп і кіраўніцтве імі маюцца сур'ёзныя недахопы. Так, партыйныя групы ўсё яшчэ недастаткова ўдзяляюць увагі пытанням вучобы, наведвання заняткаў. У выніку да гэтага часу ёсць камуністы з акадэмічнай запазычанасцю, якія сістэматычна не наведваюць заняткаў, асабліва на старэйшых курсах, дзе на лекцыях часта прысутнічае менш палловы студэнтаў. Другім сур'ёзным недахопам з'яўляецца тое, што партгрупы мала займаюцца пытаннямі партыйнай дысцыпліны. Напрыклад, аднойчы на сходзе адсутнічала 36 камуністаў, з іх 20 па невядомай прычыне. А такія камуністы, як Нікалаеў, Дуліч сістэматычна не наведваюць факультэцкіх сходаў.

Гэта, мабыць, здараецца, таму, што партыйнае бюро факультэта не аказвае яшчэ дастатковай дапамогі партгрупам у арганізацыі іх работы па выхаванню студэнтаў, палепшанню вучобы і дысцыпліны. Так, члены патрбюро мала бываюць у партгрупах, вучоба партгрупоргаў праводзіцца не рэгулярна, бывае так, што на пасяджэннях партбюро адсутнічаюць многія партгрупоргі.

Члены партбюро рашэннем парткома абавязаны часцей бываць у партгрупах, аказваць ім дзейсную дапамогу па арганізацыі ўсёй выхаваўчай і вучэбнай работы.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

## ТАК ДАЛЕЙ НЕЛЬГА

Наша газета ў свой час звяртала ўвагу на недахопы так званага пераходнага плана на IV курсе хімфака. Невядома, хто санкцыяніраваў такі план, складзены без уліку канкрэтных умоў і існуючых педагагічных норм. Даволі сказаць, што па палітэканоміі ён вельмі ўрэзаны. Але, на жаль, вучэбная частка аніяк не рэагавала на сігналы друку, а пры планаванні экзаменаў былі дапушчаны новыя недакладнасці. Так, экзамены па філасофіі студэнты здалі датэрмінова—30 снежня, калі фактычна праводзіліся яшчэ заняткі. Зразумела, што студэнты рыхтаваліся не да чарговых заняткаў, а да экзаменаў па філасофіі і гэта, між іншым, адна з прычын таго, што ў апошняй дэкадзе снежня наведванне студэнтамі лекцый і практычных заняткаў рэзка знізілася.

На падрыхтоўку да экзамена па палітычнай эканоміі было адведзена толькі 5 дзён, што таксама не спрыяла грунтоўнаму засваенню праграмнага матэрыялу.

Нягледзячы на такія неспрыяльныя ўмовы, найбольш добрасумленныя студэнты паказалі глыбокія веды на экзаменах. Вельмі прыемна было слухаць грунтоўныя адказы Дзеніскевіч, Каробкінай, Шыманскай, Пушкаровай і іншых. Але для асноўнай масы студэнтаў такі непрадуманы план быў непасільны, і як вынік у групе шмат здавальняючых адзнак. Былі і нездавальняючыя адказы, слабыя веды паказалі студэнты Цітарэнка, Шрамянок.

Асаблівыя хібы ў адказах студэнтаў мелі месца па тых раздзелах праграмы, па якіх не чыталіся лекцыі і не праводзіліся семінарскія заняткі.

Пакуль што экзамен праведзен у адной толькі групе неарганічнай хіміі і палімераў. Але ўжо можна зрабіць некаторыя вынікі. Неабходна рашуча палепшыць навучальны план, расцягнуць на больш доўгі тэрмін чытанне курса, павялічыць колькасць гадзін на палітэканомію камуністычнага спосабу вытворчасці, больш прадумана распрацоўваць расклад экзаменаў з тым разлікам, каб студэнты мелі нармальныя ўмовы для вывучэння прадмета і падрыхтоўкі да экзамена.

**А. СКУМАН,**
**дацэнт кафедры палітэканоміі.**

## Сесія!

